***Салаўёва, Т.*** *Класіка колеру Віктара Андросава / Т. Салаўёва // Витебский проспект. — 2007. — 1 нояб. — С. 2.*

**КЛАСІКА КОЛЕРУ ВІКТАРА АНДРОСАВА**



На юбілейнай выставе прадстаўлена больш за 60 работ, створаных мастаком у розныя перыяды творчага шляху, – ад самых ранніх да палотнаў нядаўніх гадоў. Сярод іх пейзажы, нацюрморты, партрэты знакамітых землякоў, жаночыя вобразы. Мастак захаваў на сваіх палотнах прыгажосць прыроды – Палесся, дзе прайшло яго дзяцінства, і куткоў Віцебшчыны – Браслаўшчыны, Ушаччыны. Выпускнік інстытута жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна пры Акадэміі мастацтваў СССР, В. Андросаў прыехаў у Віцебск у 1969 годзе, і з таго часу наш горад стаў для яго другой радзімай. В. Андросаў працаваў у абласных мастацка-вытворчых майстэрнях горада, затым выкладаў на мастацка-графічным факультэце ВДПІ.

Сакавітыя, радасныя колеры работ Андросава, напэўна, бяруць вытокі ў Грузіі, дзе нарадзіўся мастак. А лірычнасць і дабрыня яго пэндзаля, мабыць, напрацавана за гады жыцця ў краіне блакітных азёр і белых бяроз.

Андросаў захаваў на сваіх палотнах класічныя, гістарычна значныя для культуры радзімы вобразы – А. Пушкіна, У. Высоцкага, Я. Коласа, а таксама найбольш важныя для гісторыі народа з'явы – Вялікую Айчынную вайну, Чарнобыльскую трагедыю. Таму гэтая выстава ў некаторым родзе летапісная (як для мастака, так і для краіны), а ягоны творчы шлях мастака, тут прадстаўлены ў сваім развіцці.

Віктар Аляксандравіч – незвычайна працаздольны чалавек. Ён удзельнік міжнароднага пленэра ў Тураве, пленэра, прысвечанага Хруцкаму, што праходзіў на Браслаўшчыне, Ушацкага пленэра, шматлікіх абласных, рэспубліканскіх, усесаюзных (у гады існавання СССР) і міжнародных выстаў. Працуе ў розных жанрах – партрэт, нацюрморт, тэматычная карціна. Але партрэтны жанр – любімы ў мастака. «Трэба зацікавіцца асобай чалавека, каб апісаць добры партрэт, лічыць В. Андросаў, – таму што галоўнае – перадаць яго ўнутраны свет».

В. Андросаў, прайшоўшы акадэмічную школу малявання і жывапісу, застаецца верны класічнаму метаду ў мастацтве.

**Таццяна Салаўёва**